Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 273 (342)
СЕРАДА
27
ЛІСТАПАДА
1940 г.

Цана 10 капеек.

СМЯЛЕЙ ВЫЛУЧАЦЬ ЛЕПШЫХ АКТЫВІСТАЎ НА КІРУЮЧУЮ РАБОТУ

У былой панскай Польшчы рабочыя, служачыя, працоўныя сяляне нават не маглі марыць аб вылучэнні іх на адказныя кіруючыя пасты. Кожны думаў толькі аб тым, каб як - небудзь пракарміць сям'ю. Дзесяткі тысяч рабочых, работніц і служачых гадамі былі беспрацоўнымі. Толькі ў адным Беластоку было звыш 20 тысяч беспрацоўных.

Зусім іншае становішча цяпер. Вызваленыя Чырвонай Арміяй народы Заходняй Беларусі карыстаюцца ўсімі правамі, запісанымі ў Сталінскай Канстытуцыі. Яны атрымалі шырокую магчымасць прымаць самы актыўны ўдзел ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва.

Па нашай вобласці на кіруючую работу вылучана 11.598 чалавек. У Беластоку на прадпрыемствах, ва ўстановах на гаспадарчую, совецкую і іншую работу вылучала 1. 146 чалавек. На тэкстыльных прадпрыемствах з ліку лепшых актывістаў вылучана на пасады дырэктараў фабрык, намеснікаў дырэктараў, начальнікаў цэхаў, майстраў 513 чалавек. У харчовай прамысловасці Беластока вылучана 68 чалавек, па гарадскому аддзелу народнай асветы 44 чалавекі і т. д.

Былая работніца тэкстыльнага камбіната № 1 тав. Пятроўская працуе намеснікам старшыні Беластоцкага горвыканкома. Былы палітзняволены тав. Топаль, які больш 12 год прасядзеў у турме, працуе дырэктарам вацінна-ватнай фабрыкі № 32. Былы беспрацоўны тав. Раковіч зараз—начальнік цэха 2-га скурзавода. Тав. Турлейскі з'яўляецца старшынёй Ломжынскага горвыканкома, тэкстыльшчыца тав. Марыя Дзьячук працуе ў абласным аддзеле соцыяльнага забеспячэння.

2.661 чалавек вылучаны на кіруючую совецкую работу. 11 вылучэнцаў працуе старшынямі гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, 319—старшынямі сельсоветаў, 358—сакратарамі сельсоветаў.

Значная колькасць актывістаў вылучана па сістэме кааперацыі. Старшынямі сельпо працуе 166 чалавек.

Пераважная большасць вылучэнцаў у нашай вобласці добра спраўляецца з работай. Па-большэвіцку працуюць на кіруючай рабоце тт. Прыгыцкі, Пестрак, Турлейскі, Дзьячук і іншыя. На 25-й тэкстыльнай фабрыцы ў Беластоку, дзе дырэктарам былая работніца тав. Жэня Каплан, прадукцыйнасць працы за год павялічылася на 100 процантаў. Беластоцкая вацінна-ватная фабрыка № 32, якой кіруе вылучэнец тав. Топаль, выпускае зараз прадукцыі ў 10 разоў больш, чым выпускалі раней усе 12 вацінна-ватных фабрык Беластока. Старшыня Райскага сельсовета, Бельскага раёна, былы селянін-бядняк тав. Кучко дабіўся поўнага і своечасовага выканання дзяржаўных паставак па сельсовету. У гэтым сельсовеце арганізавана 5 калгасаў. Добра паставіў работу на сяле старшыня Шулібаўскага сельсовета (Чыжаўскі раён) тав. Юрчак.

У радзе пярвічных партыйных арганізацый, на многіх прадпрыемствах і ўстановах Беластока, Гродна і іншых раёнаў з вылучэнцамі сістэматычна праводзяць вытворчыя нарады, семінары, арганізоўваюць абмен вопытам работы і т. д. Рознымі гаспадарчымі курсамі на прадпрыемствах вобласці было за год ахоплена 1.056 чалавек, месячнымі курсамі старшынь і сакратароў сельсоветаў — 552 чалавекі. Усяго па вобласці на курсах у гэтым годзе займалася 4.742 чалавекі.

Аднак у большасці гарадоў і раёнаў нашай вобласці работа па вылучэнню і выхаванню кадраў пастаўлена яшчэ зусім слаба.

У многіх арганізацыях, установах, прадпрыемствах зусім мала вылучана на кіруючую работу жанчын. У гандлёвых арганізацыях Беластока з 60 вылучэнцаў толькі 14 жанчын. На тэкстыльных прадпрыемствах Беластока вылучана толькі 118 жанчын—23 процанты ўсяго ліку вылучэнцаў.

Не ўсюды пастаўлена як след выхаваўчая работа з вылучэнцамі. Адпушчаныя сродкі на абучэнне вылучэнцаў часта астаюцца невыкарыстанымі. Трэст сталовых, рэстаранаў і кафэ з асігнаваных 44 тысяч рублёў на падрыхтоўку кадраў выдаткаваў толькі 5 тысяч рублёў, на беластоцкім шклозаводзе з асігнаваных 1.600 рублёў выдаткавана толькі 700 рублёў.

Разам з тым неабходна падкрэсліць, што на радзе прадпрыемстваў і ўстаноў да вылучэнцаў адносяцца не па-большэвіцку. Вельмі часта маюць месца факты, калі вылучаныя таварышы без усякіх падстаў адстараняюцца ад займаемых пасад. Без падстаў вызвалены ад работы, напрыклад, аграном Саколкаўскай кантрольна - насеннай лабараторыі тав. Жызнеўскі, намеснік галоўнага бухгалтара 29-й фабрыкі тав. Ліпман і іншыя.

Партыйным арганізацыям нашай вобласці неабходна прыняць усе меры да таго, каб работа па вылучэнню новых кадраў была пастаўлена на належную вышыню. Трэба смялей вылучаць лепшых рабочых, служачых і працоўных сялян-актывістаў на адказныя пасты на прадпрыемствах, у калгасах, ва ўстановах і грамадскіх арганізацыях.

Новыя кадры можна і неабходна чэрпаць з ліку новай арміі актывістаў, якія зараз праводзяць вялікую работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У рабоце па падрыхтоўцы да выбараў удзельнічаюць звыш 80 тысяч актывістаў нашай вобласці.

«. . Клапатліва вырашчваць кадры, дапамагаць кожнаму растучаму работніку падняцца ўверх, — таварыў таварыш Сталін, — не шкадаваць часу для таго, каб цярпліва «павазіцца» з такімі работнікамі і паскорыць іх рост».

Гэтымі большэвіцкімі палажэннямі, высунутымі правадыром народаў таварышам Сталіным на XVIII з'ездзе ВКП(б), павінны штодзённа кіравацца кіраўнікі партыйных, совецкіх, гаспадарчых і іншых арганізацый.

Па-сталінску расціць і выхоўваць кадры—такава задача!



Ля прызыўнога пункта Сталінскага раёна г. Мінска (злева направа): А. Г. Жыткоў, А. Т. Цімэпчык і Е. П. Садоўскі, атрымаўшыя пуцёўкі ў рамесленыя вучылішчы.
Фота І. Шышко.
Фотахроніка БЕЛТА.

РЫХТУЮЦЦА ДА ПРОВАДАЎ ПРЫЗЫЎНІКОЎ У РАМЕСЛЕНЫЯ, ЧЫГУНАЧНЫЯ ВУЧЫЛІШЧЫ І ШКОЛЫ ФЗА

БРАНСК. З вялікім уздымам прайшоў прызыў моладзі ў чыгуначныя, рамесленыя вучылішчы і школы фабрычна-заводскага абучэння. Прынятая моладзь з нецярплівасцю чакае дня адпраўкі на вучобу.

Напярэдадні адпраўкі ў Бранску будзе праведзен сход прызыўнікоў сумесна з іх бацькамі.

ГРОДНА. Комсамольская арганізацыя горада рыхтуецца да сустрэчы моладзі, якая прыязджае ў Гродненскае рамесленае вучылішча. Для арганізацыі сустрэчы вылучаны адказныя таварышы. З 25 лістапада на станцыі Гродна ўстаноўлена дзяжурства.

ЛАПЫ. Прызваныя ў чыгуначнае вучылішча ў Лапскім раёне з натхненнем чакаюць дня ад'езду на вучобу. Прызыў у Лапах прайшоў з велізарным уздымам. На 25 месц паступіла 80 заяў.

З прызыўнікамі ўжо праведзены 2 гутаркі. 19 лістапада была прачытана лекцыя аб росце соцыялістычнай прамысловасці. 24 лістапада яны праслухалі лекцыю аб чыгуначным транспарце нашай краіны. Гутарка выклікала ў слухачоў многа пытанняў.

АЎГУСТОЎ. Закончыўся прызыў па Аўгустоўскаму раёну. На 30 месц паступіла 120 заяў. Цяпер у Аўгустове ідзе актыўная падрыхтоўка да провадаў прызваных у Гродненскае рамесленае вучылішча. У доме соцыялістычнай культуры намечана правесці вечар провадаў.

Выбаршчыкі сустракаюцца са сваімі кандыдатамі ў дэпутаты

У 15-й выбарчай акрузе па выбарах у Ломжынскі гарадскі Совет дэпутатаў працоўных разгорнута агітацыйна-масавая работа сярод выбаршчыкаў. Рад агітатараў, як тт. Фрохт і Кацэр, правялі гутаркі па 3—4 разы. Агітатары расказваюць выбаршчыкам пра жыццё рабочых і сялян у былой панскай Польшчы, а таксама пра дасягненні Совецкага Саюза за сталінскія пяцігодкі. Выбаршчыкі цікавяцца пытаннямі міжнароднага становішча.

У 12-й выбарчай акрузе ў гутарцы з выбаршчыкамі да агітатара тав. Фрохта звярнуўся з пытаннем 60-гадовы выбаршчык тав. Казлоўскі і папрасіў расказаць, чаму капіталісты не пішуць праўду. Агітатар даў яму вычарпальны адказ.

Старшынёй 3-га выбарчага ўчастка тав. Эпштэйнам і кіраўніком агіткалектыва тав. Горыным 16 лістапада была арганізавана сустрэча выбаршчыкаў з кандыдатамі, якія балатыруюцца па выбарчых акругах, уваходзячых у 3-і выбарчы ўчастак. На сход быў запрошан дакладчык тав. Кузьмін, які зрабіў даклад на тэму: «Сталінская Канстытуцыя — самая дэмакратычная канстытуцыя ў свеце». Пасля даклада кандыдаты расказалі свае аўтабіяграфіі.

Тав. Бакула, вылучаны рабочымі хлебазавода кандыдатам у дэпутаты гарадскога Совета, які балатыруецца па 11-й выбарчай акрузе, у сваім выступленні запэўніў выбаршчыкаў, што ён апраўдае аказанае яму давер'е.

— Мы, працоўныя Заходняй Беларусі, — гаворыць тав. Бакула,— маем права выбіраць і быць выбранымі ў Советы дэпутатаў працоўных. Аказанае мне вялікае давер'е— служыць у інтарэсах народа нашай соцыялістычнай радзімы—я з чэсцю апраўдаю.

Выступаючыя кандыдаты: тав. Якаўлева, якая балатыруецца па 12-й выбарчай акрузе, т. Панамароў — па 14-й выбарчай акрузе, т. Алькуснік — па 13-й выбарчай акрузе, дзякавалі выбаршчыкаў за аказанае ім давер'е. Пасля сход выбаршчыкі глядзелі кінокарціну «Горны марш».

На ўчастку ўстаноўлены дзяжурствы членаў участковай камісіі. Тут ёсць літаратура, прысвечаная выбарам. Выбаршчыкі, прыходзячыя на ўчастак, правяраюць сябе ў спісках, атрымоўваюць адказы на ўсе цікавячыя іх пытанні.

А. Власенка.

На сельскім выбарчым участку

Пшэхоцкая сельская выбарчая камісія Граеўскага раёна разгарнула вялікую работу па падрыхтоўцы да выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Праходзяць многалюдныя сустрэчы выбаршчыкаў са сваімі кандыдатамі ў дэпутаты райсовета. Гэтыя сустрэчы ярка дэманстрыруюць адзінства народа, яго давер'е да кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У вёсках і паселішчах пачалася агітацыя за кандыдатаў. У Пшэхоцкім сельсовеце працуюць 29 гурткоў, якія наведваюць каля 700 выбаршчыкаў. На выбарчым участку таксама працуе гурток, якім кіруе старшыня сельскай выбарчай камісіі тав. Каплун. Яго гутаркі і даклады вельмі даходлівыя і зразумелыя. Сярод сялян вёскі Цімошыны агітацыйную работу вядзе комсамолец тав. Кучынскі. На занятках бывае 45—50 чалавек.

Сельская выбарчая камісія закончыла абсталяванне свайго выбарчага ўчастка. Школьнікі любоўна ўпрыгожылі памяшканне ўчастка, вывешаны лозунгі, плакаты, партрэты.

Члены ўчастковай і акруговай выбарчай камісій правяраюць спіскі выбаршчыкаў шляхам паўторнага абходу дамоў.

Па ініцыятыве комсамольцаў арганізаван самадзейны мастацкі калектыў з 30 чалавек. **Н. Кобзеў.**

Мастацкую самадзейнасць—на выбарчыя ўчасткі

ДАМБРОВА. **(Ад нашага карэспандэнта).** Райком комсамола і раённы аддзел народнай асветы распрацавалі мерапрыемствы па ўдзелу мастацкіх калектываў у выбарчай кампаніі. У створаных 8 калектывах аб'еднана больш 170 чалавек.

Самадзейны калектыў Сухавольскага пасялковага Совета, якім кіруе комсамолка Мядведзева, нядаўна выступаў на выбарчым участку, дзе адбывалася сустрэча кандыдатаў у дэпутаты раённага Совета з выбаршчыкамі. Выступленні танцораў, дэкламатараў, музыкантаў і спевакоў карысталіся вялікім поспехам.

Арганізаваны таксама калектывы мастацкай самадзейнасці ў мястэчку Новы Двор і вёсцы Сідра.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

64. Па акрузе **№ 105** зарэгістрыраван Нісан Ідэлевіч **Гальперын,** 1903 г. нараджэння, член ВКП(б), дырэктар 31-й плюшавай фабрыкі, вылучаны калектывам фабрыкі.

65. Па акрузе **№ 119** зарэгістрыравана Ольга Андрэеўна **Налівайка,** 1918 г. нараджэння, член ВЛКСМ, студэнтка педінстытута, вылучаная сходам калектыва педінстытута.

66. Па акрузе **№ 13** зарэгістрыраван Макарый Уладзіміравіч **Мяжэвіч,** 1903 г. нараджэння, член ВКП(б), загадчык гарадскім аддзелам аховы здароўя, вылучаны калектывам работнікаў 2-й бальніцы, 2-й палікліпікі, 2-й дзіцячай кансультацыі і вендыспансера.

67. Па акрузе **№ 89** зарэгістрырована Еўдакія Уладзіміраўна **Сарокіна,** 1903 г. нараджэння, член ВКП(б) з 1928 г., настаўніца 15-й школы, вылучаная калектывамі 15, 30 і 27-й школ і работнікаў гарадскога аддзела народнай асветы.

68. Па акрузе **№ 155** зарэгістрырована Геня Майсееўна **Рубіновіч,** 1898 г. нараджэння, беспартыйная, прадаўшчыца ў секцыі гатовага адзення Беластоцкага універмага, вылучаная калектывам універмага.

69. Па акрузе **№ 56** зарэгістрырована Марыя Марцінаўна **Завістоўская,** 1897 г. нараджэння, беспартыйная, работніца 13-й тэкстыльнай фабрыкі, вылучаная калектывам фабрыкі.

70. Па акрузе **№ 80** зарэгістрыраван Герш Абрамавіч **Тыкоцкі,** 1920 г. нараджэння, член ВЛКСМ, ткач 1-га тэкстыльнага камбіната, вылучаны калектывам камбіната.

71. Па акрузе **№ 196** зарэгістрыраван Канстанцін Андрэевіч **Бабакін,** 1906 г. нараджэння, член ВКП(б), сакратар партбюро паравознага дэпо ст. Беласток, вылучаны калектывам паравознага дэпо.

72. Па акрузе **№ 198** зарэгістрыраван Мечыслаў Хілевіч **Шотланд,** 1910 г. нараджэння, беспартыйны, старшыня камітэта профсаюза комунальнікаў, вылучаны калектывам водаканалтрэста.

73. Па акрузе **№ 171** зарэгістрырована Леакадзія Канстанцінаўна **Канецкая,** 1910 г. нараджэння, беспартыйная, санітарка 2-й гарадской бальніцы, вылучаная калектывамі работнікаў 2-й бальніцы, 2-й палікліпікі, 2-й дзіцячай кансультацыі і вендыспансера.

74. Па акрузе **№ 146** зарэгістрырована Валенціна Юльянаўна **Ізмайловіч,** 1916 г. нараджэння, кандыдат ВКП(б), комсорг ЦК ВЛКСМ у педвучылішчы, вылучаная калектывам студэнтаў і выкладчыкаў педвучылішча і рабфака.

75. Па акрузе **№ 23** зарэгістрырована Яніна Густаваўна **Нізінская,** 1904 г. нараджэння, беспартыйная, настаўніца 1-й сярэдняй школы, вылучаная педкалектывамі 1, 3, 5, 7 і 13-й школ.

76. Па акрузе **№ 191** зарэгістрыраван Грыгорый Іванавіч **Бізюк,** 1906 г. нараджэння, беспартыйны, брыгадзір паравога абаграванія, вагоннага ўчастка, вылучаны калектывам вагоннага ўчастка Беласток-2.

77. Па акрузе **№ 189** зарэгістрыраван Іларыён Паўлавіч **Максіменка,** 1909 г. нараджэння, кандыдат ВКП(б), дырэктар 2-й сярэдняй школы, вылучаны калектывам Беластоцкага аддзялення і палітаддзела аддзялення службы руху Беластоцкай чыгункі.

78. Па акрузе **№ 226** зарэгістрыраван Нікандр Кірылавіч **Волкаў,** 1897 г. нараджэння, член ВКП(б) з 1920 г., старшыня горплана пры горвыканкоме, вылучаны калектывам кафельна-плітачнага завода № 15.

79. Па акрузе **№ 15** зарэгістрыраван Станіслаў Ігнатавіч **Лапот,** 1914 г. нараджэння, беспартыйны, начальнік змены шклозавода, вылучаны калектывам шклозавода.

80. Па акрузе **№ 63** зарэгістрыраван Феадосій Самуілавіч **Крымскі,** 1903 г. нараджэння, член ВКП(б), намеснік дырэктара горхарчпромгандлю, вылучаны калектывам работнікаў транспарта і будаўнічай канторы горхарчпромгандлю.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

28-га лістапада, у 8 гадзін вечара, у чытальным зале Дома партасветы (вул. Талстога, 9) адбудзецца нарада старшынь участковых выбарчых камісій горада Беластока.

Беластоцкі гарадскі выканаўчы камітэт.

Урачысты вечар, прысвечаны памяці Адама Міцкевіча

Учора ў гарадскім тэатры адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 85-годдзю з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча.

Ад імені юбілейнага камітэта вечар адкрыў намеснік старшыні Беластоцкага аблвыканкома, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Прыгыцкі.

— Сёння,—сказаў ён,—мы разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза адзначаем юбілей Адама Міцкевіча. Мы шануем вялікага польскага паэта, калыханка якога стаяла ў Навагрудчыне. Аддаем доўжнае вялікаму чалавеку, інтэрнацыяналісту, які ў даўнія годы бясстрашна і ўпікску здолеў убачыць у кожнай нацыі дзве нацыі: прыгнечаных і прыгнятальнікаў. Толькі цяпер, у Совецкім Саюзе, ажыццяўляюцца мары паэта аб тым, каб яго кнігі прыйшлі ў сялянскія хаты.

З выдатным дакладам аб жыцці і творчасці Міцкевіча выступіў тав. Вольпе.

У яркіх словах дакладчык намаляваў творчы шлях паэта.

— Ніколі, — падкрэсліў ён,— не быў Міцкевіч такі блізкі нам, як зараз, калі нам заззяла сонца свабоды. Мы шануем у Міцкевічу не толькі вялікага паэта, але чалавека і вялікага грамадзяніна, які ўмеў у свой час спалучаць ідэю з дзеяннем.

У мастацкай частцы вечара выступіў увесь калектыў польскага тэатра, артысты яўрэйскага тэатра, Беластоцкай філармоніі і ордэна Чырвонага Працоўнага Сцяга Ленінградскай філармоніі.

З вялікім поспехам былі выкананы ўрыўкі з «Пана Тадэуша», «Канрада Валенрода», вершы «Ваявода», «Будрыс і яго сыны», «Да рускіх сяброў», «Бура» і іншыя.

Па Совецкай краіне

У СТАЛІЦЫ СОВЕЦКАЙ ЛАТВІІ

РЫГА. Працоўныя сталіцы дзейна рыхтуюцца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У горадзе створана 193 выбарчых участкі. Гарадское самаўпраўленне прыступіла да абсталявання памяшканняў для іх. Пачалася падрыхтоўка да складання спісаў выбаршчыкаў.

На прадпрыемствах і ў совецкіх установах праходзяць масавыя сходы працоўных, прысвечаныя выбарчай кампаніі. Пярвічныя партыйныя арганізацыі выдзелілі для масава-растлумачальнай работы сярод выбаршчыкаў тысячы бяседчыкаў, кіраўнікоў гурткоў з ліку партыйнага, профсаюзнага актыва і перадавых комсамольцаў. У адным толькі Задвінскім раёне к агітацыйнай рабоце прыцягнута 1.575 чалавек. На буйнейшых прадпрыемствах гэтага раёна арганізавана 73 семінары агітатараў.

ЗІМНІ СПАРТЫЎНЫ СЕЗОН

У радзе краёў і абласцей адкрыўся зімні спартыўны сезон.

У Іркуцку адбыўся першы агульнагарадскі лыжны выхад. У ім прынялі ўдзел 4.500 лыжнікаў.

У Краснаярску адкрыліся каткі. Адбылася першая сустрэча хакейных каманд. Фізкультурнікі «Лакаматыва» арганізавалі лыжны выхад за горад.



Від на адзін з куткоў доменнага цэха Кузнецкага металургічнага камбіната імені Сталіна.
Фота І. Аляксандрава. Фота ТАСС.

СЕСІЯ, ПРЫСВЕЧАНАЯ МІЦКЕВІЧУ

У Маскоўскім інстытуце гісторыі, філасофіі і літаратуры імені Чэрнышэўскага адкрылася навуковая сесія, прысвечаная 85-годдзю з дня смерці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. З дакладам «Адам Міцкевіч і яго рускія сябры» выступіў прафесар М. А. Цяўлоўскі.

У вестыбюлі інстытута арганізавана невялікая выстаўка твораў Міцкевіча на польскай і рускай мовах.

Сярод іх некаторыя рэдкія выданні паэмы «Пан Тадэуш», «Пераклады з Міцкевіча» і інш. 60-х і 80-х гадоў.

У Львоў для ўдзелу ў шанаванні памяці Міцкевіча інстытут камандыраваў прафесара Д. Д. Благога.

ЖАНЧЫНЫ-ТРАКТАРЫСТКІ

Каля 1.500 жанчын авалодалі трактарнай справай у гэтым годзе без адрыву ад вытворчасці ў гаспадарках Наркомсоўгасаў Украіны. У цяперашні час многа работніц соўгасаў навучаецца на курсах камбайнераў, шофераў і кіномеханікаў.

КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ АБЛАСНОГА СОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

Выбаршчыкі Сухавольскай выбарчай акругі №45, Дамброўскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Сяргея Осіпавіча ПРЫТЫЦКАГА!

★ ★ ★

Сяргей Осіпавіч Прытыцкі

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Просты, адкрыты, глыбокі погляд яго вачэй, і столькі праўды і прастаты ў гэтых вачах чалавека вялікіх думак, вялікай справы і вялікага сэрца!

Гэта сэрца ён даўно аддаў таму, чыім верным сынам прыходзіцца — аддаў свайму многапакутваўшаму народу. З ранняй пары свайго жыцця ён бачыў, як зняволен, як бедзен прыгнечаны народ, і разумеў, як разам з тым гэты народ глыбока адчуваў сваё бяспраўе, пратэставаў супроць яго і змагаўся за лепшую далю.

І народ шанаваў дастойнага сына свайго, любіў яго і аберагаў. Толькі крывавыя акупанты стараліся адгарадзіць яго ад яго народа мурамі крывавых катаванняў.

Ён паміраў ад куль катаў, але быў прыведзен да жыцця забойцамі, для таго, каб быць павешаным. Пратэст пролетарыята ўсёй Польшчы і іншых краін ратаваў яго ад шыбеніцы, тады каты адправілі яго ў кайданах на вечную катаргу. Але перамагла справа, за якую ён аддаў сваю маладосць—руку дапамогі падаў совецкі народ.

Вызвалены з-пад гнёту акупантаў, народ выбраў вялікае Народнае Сабранне, каб на ім рашыць, куды накіраваць свае далейшыя гістарычныя поступы. Ён выбраў лепшых прадстаўнікоў у Народнае Сабранне, і першым з лепшых быў Прытыцкі.

Народнае Сабранне поўнасцю выканала волю народа. Вуснамі Сяргея Прытыцкага—члена Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сабрання — было заяўлена на Пятай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР аб жаданні заходнебеларускага народа з'еднацца з Совецкім Саюзам. Вялікая совецкая краіна прыняла вызвалены народ у сваю сям'ю. І калі трэба было выбраць дэпутатаў у Вярхоўны Совет соцыялістычнай краіны ад вызваленых абласцей, заходнебеларускі народ зноў у ліку першых выбірае Прытыцкага.

Сяргей Прытыцкі, рэволюцыянер, які змагаўся за свабоднае жыццё свайго народа і зараз убачыў сам гэта жыццё і ўбачыў, як рады таму народ. Гэтым новым жыццём трэба разумна кіраваць. І да руля дзяржаўнага кіравання па волі народа становіцца Сяргей Прытыцкі.

Практычная дзяржаўная дзейнасць тав. Прытыцкага пачалася на пасту намесніка старшыні Беластоцкага аблвыканкома—органа, які ахапляе велізарны круг грамадскіх пытанняў.



Паміма велізарнай бягучай работы ў кіруючых работнікаў аблвыканкома да іх прыходзіць заўсёды мноства наведвальнікаў.

Да тав. Прытыцкага звяртаюцца людзі з самымі рознастайнымі пытаннямі. Часта гэта могуць вырашыць на месцы нізавыя арганізацыі, але людзям так здаецца, што лепш за ўсё сходзіць да Прытыцкага: ад яго не пойдзеш безрэзультатна.

Асабліва ўнушальная яго перапіска. Да Прытыцкага пішуць не толькі выбаршчыкі яго акругі, яму пішуць з усіх канцоў велізарнай Совецкай краіны. Зараз многа пішуць з новых совецкіх рэспублік і абласцей. І гэтыя пісьмы совецкіх грамадзян толькі больш радуюць народнага выбранніка.

Грамадзянка Гардзейчык піша з Куйбышэва (былая Самара), што яна ў час імперыялістычнай вайны выехала з роднага месца, недзе каля Беластока, у Расію і згубіла сваіх бацькоў. Яна іх не бачыла больш 20 год і зараз вельмі хоча ведаць, што з імі.

І хоць справа гэта не лёгкая, Сяргей Осіпавіч яе «прыняў да выканання». Ён пісаў ва ўсе арганізацыі нашай області, суседніх абласцей, усходніх абласцей, званіў па тэлефону, рабіў сотні запросаў і тры месяцы шукаў старых Гардзейчыкаў. І ён знайшоў іх! Ён знайшоў іх у Баранавіцкай області, у Васілішкаўскім раёне, і зараз-жа паведаміў дачцы.

Такая настойлівасць, выключная ўважлівасць і чуласць—гэта стыль усёй велізарнай работы, вялікай дзяржаўнай дзейнасці тав. Прытыцкага. І народ любіць яго за гэтыя большэвіцкія якасці.

Тав. Прытыцкі вельмі многа працуе. З 9 гадзін раніцы да поўначы і за поўнач вы знойдзеце яго за рабочым сталом. Яго работа гэта сапраўднае гарэнне, страснае жаданне аддаць справе ўсяго сябе. Ён нічога не адкладвае, нібы баючыся, што калі ён не зробіць тэтага сёння, яму не дадуць зрабіць заўтра, адарвуць ад гэтай справы на другую, больш неадкладную. І яго часта адрываюць паездкі па службовых і дэпутацкіх справах.

Не гаворачы аб выездах на Сесіі Вярхоўнага Совета, тав. Прытыцкага часта запрашаюць з розных рэспублік Совецкага Саюза на народныя ўрачыстасці. Толькі днямі ён вярнуўся з трохтыднёвай паездкі на святкаванне 20-гадовага юбілея Казахскай ССР. Ён прывёз надзвычайна цікавыя ўражанні аб жыцці, аб адраджэнні мужнага казахскага народа, які за пяць тысяч кілометраў сочыць з братняй увагай за жыццём свабоднага народа Совецкай Беларусі. Ён прывёз уражанні аб багацці і харастве ўсіх рэспублік магутнага Совецкага Саюза, аб шчаслівым жыцці ўсіх совецкіх народаў.

* * *

Зараз, калі працоўныя заходніх абласцей на шматлікіх сходах намячалі сваіх кандыдатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных, выбаршчыкі Сухавольскай выбарчай акругі № 45, Дамброўскага раёна, аднадушна выставілі і падтрымалі кандыдатуру Сяргея Осіпавіча Прытыцкага. Слаўны сын працоўнага народа апраўдае і гэта народнае давер'е—лепшую радасць яго прыгожага жыцця.

І. Клінаў.



На здымку: група кандыдатаў у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных (злева направа) Скаўронскі І. Д. (Заблудаўскі раён), Саломава О. І. (Гродненскі раён), Говар К. І. (Гродненскі раён), Вітукевіч Р. І. (Дамброўскі раён), Мураўскі А. І. (Бранскі раён) і Галіцкі М. А. (Беластоцкі раён).

Фота А. Сапіра.

Выбаршчыкі Карыцынскай выбарчай акругі № 26, Бранскага раёна! 15 снежня ўсе як адзін аддавайце свае галасы за Франца Вікенцьевіча МАЛІНОЎСКАГА

★ ★ ★

Франц Вікенцьевіч Маліноўскі

(*БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС*)

Бацька яго быў «вырабнікам»— гэта значыць батраком.

Гэта быў чалавек непісьменны і не вельмі добра разбіраўшыйся ў праграмах розных партый, але ён быў рэволюцыянерам і ў 1905 годзе арганізоўваў забастоўкі сельскіх рабочых у Сакалоўскім павеце, прымаў удзел у іншых выступленнях, за што быў тады арыштаваны. Пяцёра дзяцей жылі ўпрогаладзь.

Франэку было тады 8 год. Два годы пазней ён пачаў сваё працоўнае жыццё: батрачыў у памешчыкаў або ў кулакоў. 16-гадовым юнаком пайшоў працаваць у кузню, а затым рабочым на будоўлях і зноў батраком.

Летам 1918 года арганізуецца ў яго вёсцы Рогаў, Сакалоўскага павета (Варшаўскае ваяводства), рэволюцыйны гурток, да якога прымыкае і Маліноўскі. У канцы гэтага-ж года разгортваецца ва ўсёй Польшчы магутны рэволюцыйны рух. Маліноўскі прымае ў ім актыўны ўдзел: ён распаўсюджвае лістоўкі, арганізуе забастоўкі батракоў і сялянскія выступленні. Маліноўскага арыштоўваюць і асуджаюць на 2 годы турмы.

У 1920 годзе, калі Чырвоная Армія ішла на Варшаву, Маліноўскі ўваходзіць у састаў Сакалоўскага павятовага рэўкома. Пасля ўходу Чырвонай Арміі ён вымушан выехаць з роднай старонкі, перайсці на нелегальнае становішча, скрывацца ад паліцыі. Ён працуе на будоўлях, а ў 1922 годзе становіцца прафесіянальным рэволюцыянерам.

Усё далейшае жыццё Франца Вікенцьевіча Маліноўскага нераздзельна звязана з комуністычнай партыяй Польшчы, з рэволюцыйнай барацьбой польскіх рабочых і сялян. Ён пасылаецца ў розныя акругі, дзе кіруе работай партыйных арганізацый, а на працягу 5 год працуе над арганізацыяй польскіх сялян і кіруе іх барацьбой супроць падаткаў, за зямлю і рабоча-сялянскі ўрад.

1932 год. Маліноўскі ў вугальным басейне. Гарнякі Дамброва падняліся на барацьбу супроць невыноснай эксплаатацыі, супроць



пастаянага звальнення рабочых, зніжэння заработнай платы, капіталістычнай рацыяналізацыі. Пяць тыдняў працягвалася забастоўка. Стойка трымаліся гарнякі, але вугальныя бароны не ішлі на ўступкі. Даведзеныя да роспачы рабочыя кінулі лозунг «чорнай забастоўкі», гэта значыць, зняць з работы рабочых пры насосах, затапіць шахты. Мабілізаваная паліцыя расстрэльвае рабочыя сходы. Шасцёра забітых падаюць ад куль паліцыі на мітынгу пад Дамбровам. Дзесяткі і сотні параненых у Мілёвіцах, Пясках і іншых гарняцкіх пасёлках.

1933 год. Маліноўскі ў Лодзі. 100 тысяч тэкстыльшчыкаў Лодзінскай акругі бастуюць за павышэнне заработнай платы, за правы фабрычных дэлегатаў, за калектыўны дагавор. Пэпээсаўцы ўзначальваюць профсаюз, але масамі кіруюць комуністы. Пэпээсаўскае кіраўніцтва здраджвае: правадыр лодзінскай ППС Шчэркоўскі едзе ў Варшаву і падпісвае ў міністэрстве капітулянцкі дагавор. Пагражае зрыў забастоўкі. Але лодзінскія комуністы бяруць кіраўніцтва рухам у свае рукі. Па вуліцах Лодзі праходзіць многатысячная дэманстрацыя бастуючых, якія нясуць труну з лялькай Шчэркоўскага і падпісаны ім дагавор. Забастоўка працягваецца. Спалоханыя фабрыканты здаюцца, рабочыя дабіліся перамогі.

У 1936 годзе Маліноўскі зноў у Лодзі. Ён арганізуе першамайскую дэманстрацыю. Пад націскам рабочых пэпээсаўцы вымушаны згадзіцца на агульную дэманстрацыю. 120 тысяч рабочых ішлі пад чырвонымі сцягамі са спевам рэволюцыйных песень і з велізарнымі партрэтамі Леніна і Сталіна. Паліцыя баялася іх крануць.

Маліноўскі часта арыштоўваецца, сядзіць у турме, а пасля выхаду на свабоду зноў прыступае да партыйнай работы, па-за якой ён ужо не мысліць свайго жыцця.

Пасля развалу Польшчы Маліноўскі пераходзіць дэмаркацыйную лінію і прыбывае ў Беласток. На працягу некаторага часу ён працуе на плюшавай фабрыцы, затым дырэктарам кінотэатра ў Ваўкавыску, у апошні час — работнікам Беластоцкага горжылупраўлення.

Працоўныя Бранскага раёна вылучылі тав. Франца Вікенцьевіча Маліноўскага, сына батрака, рабочага-рэволюцыянера сваім кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Аказанае яму давер'е ён апраўдае з чэсцю. Залогам гэтаму з'яўляецца ўвесь жыццёвы шлях тав. Франца Вікенцьевіча Маліноўскага.

М. Новагрудскі.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Советы

Словы большэвіцкай агітацыі данесці да кожнага выбаршчыка

Актыўны ўдзел комсамольцаў і несаюзнай моладзі ў выбарчай кампаніі

Комсамольцы і моладзь нашай області з першых дзён выбарчай кампаніі актыўна ўключыліся ў работу па правядзенню агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў.

Тысячы комсамольцаў і перадавой моладзі працуюць агітатарамі, даверанымі, старшынямі, сакратарамі і членамі выбарчых камісій. Больш 3-х тысяч комсамольцаў області і 2.114 чалавек несаюзнай моладзі растлумачваюць выбаршчыкам Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах у мясцовыя Советы. Па аднаму толькі Сакалкаўскаму раёну налічваецца звыш 300 агітатараў, па гораду Беластоку — 500 агітатараў. Да комсамольца-настаўніка тав. Носава ў Цэханавецкім раёне, напрыклад, збіраюцца па вечарах сяляне, каб праслухаць гутарку, атрымаць адказ на хвалюючыя пытанні. Тав. Носаў на канкрэтных прыкладах раскazвае сялянам аб дасягненнях гарадоў і вёсак області.

Па області арганізаван рад гурткоў, створана 38 комсамольска-маладзёжных агіткалектываў і 41 брыгада мастацкай самадзейнасці.

Комсамольская арганізацыя мястэчка Парэчча ў чэсць выбараў правяла два ваенізіраваных паходы. На Сабалянскім і Кобельскім выбарчых участках удзельнікамі паходу былі праведзены гутаркі аб выбарах, на антырэлігійную тэму, аб XXIII гадавіне Кастрычніцкай рэволюцыі.

Вялікую работу праводзяць сярод выбаршчыкаў вучні школ. За апошні час створана 135 брыгад дзіцячай мастацкай самадзейнасці, якія далі 70 канцэртаў на выбарчых участках. Піонеры і школьнікі беластоцкай польскай сярэдняй школы № 5 разносілі выбаршчыкам запрашальныя білеты. Пасля схода яны паказалі сваю самадзейнасць. З вялікай увагай глядзелі выбаршчыкі гэты канцэрт. 18 вучняў 9—10 класаў гэтай школы ўдзельнічалі ў складанні спіскаў выбаршчыкаў. Сіламі вучняў афармляецца выбарчы ўчастак № 6.

У Цэханавецкім раёне створана брыгада мастакоў з вучняў школ, якія малююць лозунгі і плакаты для выбарчых участкаў.

Выбарчая кампанія адзначаецца новай хваляй вытворчай і палітычнай актыўнасці комсамольцаў і моладзі. Маладзёжная брыгада 1-га тэкстыльнага камбіната ў Беластоку вытворчы план за кастрычнік выканала на 110 процантаў. Чатырохстаночнік комсамолец тав. Тыcoцкі за кастрычнік план выканаў на 118 процантаў. Маладыя рабочыя тт. Кобрыцкі, Крукоўскі і Гродненскі норму выпрацоўкі выконваюць на 120—125 процантаў. Маладая работніца Вера Рушко з 1-га тэкстыльнага камбіната з'яўляецца лепшай стаханаўкай у сваім цэху, план выконвае на 111 процантаў. Яе, як прыкладную работніцу, рабочыя камбіната вылучылі кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага гарадскога Совета. Комсамольцы чыгуначнай будканторы ў мястэчку Старасельцы тт. Удод, Кузьміч, Хомяк выконваюць вытворчы план на 205 процантаў.

Не адстаюць і вясковыя комсамольцы. Так, комсамольцы, працуючыя ў калгасе імені Варашылава, Беластоцкага раёна (сакратар пярвічнай комсамольскай арганізацыі тав. Гімік), дабіліся поўнага выканання калгасам абавязацельстваў перад дзяржавай.

Аднак усё гэта не дае ніякіх падстаў для самасупакаення.

Не ўсюды засвоілі, што выбарчы ўчастак — гэта цэнтр усёй работы. Многія комсамольцы, прымацаваныя да ўчасткаў, разгарнулі там вялікую работу. Але вось у Кольна, Бранску і некаторых іншых раёнах комсамольцы зусім слаба разгортваюць работу на выбарчых участках.

У практыцы нашай работы неабходна выкарыстаць багаты вопыт, накоплены ў перыяд правядзення выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Комсамольцы і моладзь павінны прыняць яшчэ больш актыўны ўдзел у разгортванні агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў і ў мастацкім афармленні ўчасткаў.

П. Маўрын,
сакратар Беластоцкага абкома комсамола.

Шырокі размах агітацыйна-масавай работы

Поспехі выбараў дэпутатаў у мясцовыя органы ўлады перш за ўсё залежаць ад масава-палітычнай работы сярод выбаршчыкаў. Цяпер, калі пачалася агітацыя за кандыдатаў, пытанні прапаганды і агітацыі набываюць першачарговае значэнне.

Граеўская партыйная арганізацыя прыняла рад канкрэтных мер па паляпшэнню справы вуснай і друкаванай агітацыі і прапаганды. Гэту работу вядуць агіткалектывы, якія створаны пры кожным выбарчым участку. Вялікую дапамогу аказваюць ім даверанныя асобы. Цяпер па раёну агітатарамі, прапагандыстамі, бяседчыкамі, чытчыкамі працуюць больш 500 чалавек. Імі ўжо арганізавана 286 гурткоў, у якіх займаецца 21.862 чалавекі. Выбаршчыкі актыўна наведваюць заняткі.

З агіткалектывамі рэгулярна праводзяцца семінары і інструкцыйныя даклады, на якіх вырашаюцца практычныя пытанні, звязаныя з паляпшэннем палітычнай работы з выбаршчыкамі.

Лепшымі агіткалектывамі з'яўляюцца калектывы пры Шчучынскім гарадскім і Мечынскім сельскім советах. Добра арганізавалі сваю работу ў Шчучыне агітатары тт. Кучынскі і Саламон. Заняткі праходзяць ажыўлена і пры вялікай актыўнасці прысутных. Часта тт. Кучынскі і Саламон праводзяць гутаркі на мясцовыя тэмы.

У мястэчку Вонсош ужо па 5 заняткаў з выбаршчыкамі правялі тт. Чыжэўскі, Нікіціна і Кудаева.

Актывісты-агітатары тт. Паўлаў, Цукербаум, Лякушэва, Фількінштэйн многа папрацавалі над абсталяваннем памяшкання ў выбарчых участках. Цяпер пад іх кіраўніцтвам ва ўтульных памяшканнях участковых камісій штодзённа займаюцца гурткі па вывучэнню выбарчых дакументаў. Гэтыя гурткі наведваюць больш 1.100 чалавек. У горадзе Граеве агітатары тт. Завістоўская, Фрамер правялі па 8 заняткаў з выбаршчыкамі.

Між тым у асобных агіткалектывах масава - палітычная работа яшчэ не разгорнута ў дастатковай меры. Так у Пшэходскім і Важбаўскім сельсоветах, у большасці вёсак яшчэ не створаны гурткі і не прыступілі да вывучэння Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Такія факты наглядаюцца і ў іншых месцах.

Каб ліквідаваць недахопы ў агітацыйна-масавай рабоце, райком партыі прыняў рад канкрэтных мер. Да адстаючых агіткалектываў прымацаваны таварышы з раённага партыйнага актыва. У раёне з кожным днём шырыцца размах агітацыйнай работы, павялічваецца актыўнасць выбаршчыкаў. Гэта яшчэ раз гаворыць за тое, што выбары ў мясцовыя Советы прынясуць яшчэ адну бліскучую перамогу сталінскаму блоку комуністаў і беспартыйных.

І. Цараў,
загадчык аддзелам прапаганды і агітацыі Граеўскага райкома партыі.

Сходы маладых выбаршчыкаў гор. Ваўкавыска

ВАЎКАВЫСК. (**Па тэлефону ад нашага карэспандэнта**). Днямі адбыўся сход маладых выбаршчыкаў горада Ваўкавыска. Прысутнічала больш 150 чалавек. У дакладзе аб прадстаячых выбарах і задачах моладзі работнік райкома партыі тав. Андросаў расказаў удзельнікам схода аб вялікім палітычным і вытворчым уздыме, які разгарнуўся ў раёне ў сувязі з падрыхтоўкай да выбараў.

Маладая стаханаўка мясакамбіната Ядвіга Сталярэўская вытворчае заданне выконвае на 150 процантаў, стаханаўцы швейнай фабрыкі «Атэлье мод» тт. Бурметален, Кулікоўскі і Ласевіч даюць па 140—150 процантаў плана.

Таварышы Беласік (школа № 1), Фрэй (чыгуначны вузел) і Авілаў (чыгуначная школа) у сваіх выступленнях адзначылі, што моладзь горада ўзмоцнена рыхтуецца дастойна сустрэць дзень выбараў, актыўна ўдзельнічае ў агітацыйна-масавай рабоце і паказвае выдатныя вынікі на вытворчасці.

Сход аднадушна прыняў зварот да ўсіх маладых выбаршчыкаў раёна, у якім заклікае ў дзень выбараў галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Д. Казлоў.

Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты сельскіх Советаў у Беластоцкім раёне

Па Харашчанскаму сельскаму Совету закончылася рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты сельскага Совета. Зарэгістрыравана 25 чалавек.

Па Харашчанскай выбарчай акрузе № 25 зарэгістрыраван кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета дэпутатаў працоўных ад рабочых і служачых Харашчанскай псіхіятрычнай бальніцы Аляксандр Ануфрыевіч Зайкоўскі, 1880 года нараджэння, беларус, селянін-бядняк, актыўны грамадскі работнік у сельсовеце.

Па Чырвонаармейскай выбарчай акрузе № 23 кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета зарэгістрыраван селянін Владзімір Пятровіч Янчуковіч, 1902 года нараджэння. Тав. Янчуковіч раней працаваў у псіхабальніцы ў якасці прыбіральшчыка, цяпер вылучан загадчыкам сталовай.

Па Рушчанскай выбарчай акрузе № 6 зарэгістрыраван вылучаны агульным сходам сялян вёскі Рушчаны кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета Владзімір Антонавіч Зайкоўскі, 1906 года нараджэння, селянін-бядняк.

Па Бацечкаўскаму сельскаму Совету зарэгістрыравана 17 чалавек. Заўтра поўнасцю заканчваецца рэгістрацыя кандыдатаў.

Па Фастынскай выбарчай акрузе № 16 зарэгістрыраван вылучаны агульным сходам сялян вёскі Фасты кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета 18-гадовая сялянка Надзежда Міхайлаўна Бакун. Тав. Бакун прымала актыўны ўдзел у час выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, а таксама ў рабоце сельсовета.

Кандыдатам для балатыроўкі ў Васількоўскі сельскі Совет па Васількоўскай выбарчай акрузе № 15 зарэгістрыраван актывіст вёскі Дуброўка Іосіф Мартынавіч Санчык, 1914 года нараджэння, паляк, селянін.

Па Волькаўскай выбарчай акрузе № 8 зарэгістрыраван кандыдатам у дэпутаты сельскага Совета вылучаны сялянамі вёскі Волька, Аляксандр Іванавіч Радзішэўскі, 1890 года нараджэння, беларус, селянін, актыўны грамадскі работнік.

Мае заўвагі аб якасці беластоцкага сукна

Ленінградскі рынак з'яўляецца буйным спажыўцом прадукцыі беластоцкай тэкстыльнай прамысловасці. На працягу першага і частковa другога квартала Ленінград рэалізаваў прадукцыі на суму (арыентыровачна) 60 мільёнаў рублёў, што складае каля 700 тысяч метраў.

Беластоцкія тканіны раней, калі выпрацоўкі ленінградскі спажывец сустрэў даволі адмоўна. Дастаткова было мець хоць-бы два артыкулы слабых на разрыў, як ужо думка спажыўцоў стваралася аб усім беластоцкім тавары, як аб нізкаякасным і нездавальняючым. У старой беластоцкай прадукцыі не менш 75 процантаў было тавараў зусім нездавальняючых па сваёй якасці, расцветках і афармленню рысункаў. У гэтым сказвалася цяжкая спадчына, якая дасталася ма-лалой савецкай прамысловасці ад капіталістычных фабрык. Задача заключалася ў тым, каб наладзіць асартымент беластоцкіх тканін і заваяваць сімпатыі строгага спажыўца.

У трэцім квартале, асабліва ў другой палове яго, якасць прадукцыі і рысункаў беластоцкіх тканін няямерна палепшыліся. Палепшыліся драпы артыкулаў 875, 879, а таксама артыкула 242.

Гэты зрух у паляпшэнні якасці даў нам, работнікам збыту, поўную ўпэўненасць у тым, што ў далейшым беластоцкія тканіны будуць паляпшацца і займуць адно з першых месц.

З. Кісялёў,
начальнік шарсцянага аддзела Ленінградскай гандлёвай базы «Галоўтэкстыльзбыт».



У калгасе імені Сталіна (Веткаўскі раён, Гомельская вобласць) устанаўліваецца ветраны рухавік, які будзе падаваць ваду ў жывёлагадоўчыя фермы для аўтаматычнага паення і ў воданапорныя калонкі на вуліцах калгаснай вёскі.

Фота А. Шаевіча. Фотахроніка БЕЛТА.

Пісьмы ў рэдакцыю

Культурна абслугоўваць савецкага спажыўца

Партыя і ўрад усклалі на работнікаў савецкага гандлю вялікую і адказную задачу. Многія работнікі магазінаў Горхарчпромгандлю добрасумленна адносяцца да сваёй палачотнай справы. Магазін № 54 заслужана карыстаецца аўтарытэтам сярод пакупнікоў. Яго калектыў на чале з загадчыкам магазіна тав. Гершэнкорнам культурна абслугоўвае савецкага спажыўца. Узорна пастаўлена работа і ў магазінах №№ 51, 10, 139, 80, 83 і 183. Работнікі прылаўка гэтых магазінаў рацыяналізіруюць сваю працу, рабочыя месцы ўтрымліваюць ва ўзорным парадку. Праверка дагавораў за трэці квартал паказала, што гэтыя магазіны з чэсцю выканалі ўзятыя абавязацельствы ў сацыялістычным спаборніцтве.

На жаль, ёсць такія магазіны, дзе не прывіты яшчэ элементарныя навыкі культурнага абслугоўвання спажыўцоў. Бываюць выпадкі грубых і няўважлівых адносін да пакупнікоў.

Прадаўшчыца промтаварнага магазіна горхарчпромгандлю № 84 тав. Высоцкая заўважыла, што пакупнік хоча прымерыць туфлі. Замест таго, каб запрасіць яго ў прымерачную і даць стул, яна стала нагладаць, як пакупнік у гандлёвай зале на бруднай падлозе прымярае туфлі. У магазіне № 196 прадаўшчыца тав. Барусевіч у час работы займаецца пабочнымі размовамі і не звяртае ўвагі на пакупнікоў. На просьбу пакупніка паказаць флакон адэкалону, яна з нехвотай падала флакон, які аказаўся пакрыты слоем пылу. Калі спажывец указаў на антысанітарыю, прадаўшчыца адказала: «Прыдзіце заўтра, прыбіральшчыца іх пачысціць». Зразумела, што такія людзі не тыповыя для асноўнай масы работнікаў прылаўка.

Вядома, што чыстата, утульнасць у магазіне, клапатлівa і прыгожа выкладзеныя ўзоры тавараў, адпаведныя стандартныя з чоткімі надпісамі ярлыкі цэн — усё гэта элементарныя патрабаванні, без якіх культура гандлю немысліма. Між тым ёсць і такія магазіны, якія нагадваюць усім гэтым. За прылаўкам харчовага магазіна № 114 побач з прадуктамі можна бачыць і галаўныя ўборы і іншыя тавары.

Прадуўныя з задаволеннем ідуць у тыя магазіны, дзе ім прапануюць выбар дабротных тавараў, дзе іх абслугоўваюць культурна. І работнікі савецкага гандлю павінны задавальняць законныя патрабаванні савецкага спажыўца.

Е. Баранаў.

Савецкі спажывец патрабуе прадукцыю толькі высокай якасці

Ужо больш года прайшло як да асартымента суконна-шарсцяных тканін, вырабляемых прадпрыемствамі Наркамата тэкстыльнай прамысловасці, далаўся асартымент тканін савецкага Беластока.

Перайшоўшы на выпрацоўку тканін, якія адпавядаюць тэхнічным умовам, тэкстыльшчыкі Беластока пачалі вырабляць артыкулы, якія поўнасцю адказваюць патрабаванням швейнай прамысловасці па сваёй добротнасці. Калі тканіны старай выпрацоўкі вытрымлівалі на разрыў 10, 12, 15 кілаграмаў, то цяпер драп вытрымлівае 60 і больш, а каспюмныя артыкулы—40 і больш кілаграмаў.

Значна радзей пачалі сустракацца прадзільна-ткацкія паркі. Калі ў чэрвені мы праверылі ў паніжаныя сарты 21.230 метраў. прад'явіўшы рэкламацыі на 176.112 рублёў, то ў верасні адпаведна—7781 метраў на суму 57.218 рублёў.

Але побач з поспехамі беластоцкія тэкстыльшчыкаў да гэтага часу яшчэ не зжыты паркі па фарбаванню і аддзелцы тавараў. Яшчэ мае месца дрэнная прамыўка, тлустасць, заломы, паласатасць.

Мы ўпэўнены, што беластоцкія тэкстыльшчыкі ліквідуюць указаныя недахопы і дадуць тканіну такой якасці, якую патрабуе савецкі спажывец.

П. Жукоўскі,
намеснік дырэктара матэрыяльна-тэкстыльнай базы гор. Ленінграда.

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЖЫВЁЛЕ ЦЁПЛУЮ І СЫТУЮ ЗІМОЎКУ

Жывёла будзе зімаваць у цёплым памяшканні

Калгаснікі нашай сельскагаспадарчай арцелі вялікую ўвагу ўдзялілі пытанням развіцця грамадскай жывёлагадоўлі. У выніку гэтага ў нас ёсць малочна-таварная, свінагадоўчая і аўцагадоўчая фермы. На фермах налічваецца 78 галоў жывёлы. Калі наступіла восень, мы многа папрацавалі, каб забяспечыць жывёле цёплую і сытую зімоўку.

Зараз пачался стойлавы перыяд. Для малочна-таварнай фермы мы аацілілі памяшканне. Столі ў хляве аацілілі саломай. Пабудавалі новае і цёплае памяшканне для свінагадоўчай фермы і асобна цялятнік. Ацеплены таксама канюшні.

Салому і сена мы застагавалі на-блізу канюшні і кароўніка. Кармоў у нас хопіць. Мы правялі праверку гатоўнасці нашых ферм да зімы. Праверка паказала, што мы поўнасцю падрыхтавалі цёплую зімоўку для жывёлы. Яна будзе зімаваць у цёплым памяшканні.

К. Браткоўскі,
старшыня калгаса «1 мая», Клышынскага раёна.

Нечаканасці ў хлебных магазінах

18 лістапада я ішоў па вуліцы Чкалава. Ля хлебнага магазіна № 67 мне прышлося спыніцца—з машыны згружалі прывезены з пякарні хлеб. Затрымаўся я, каб купіць хлеба. Рабочы з машыны хлеб кідаў у рукі загадчыка магазінам, які стаяў у дзвярах. Апошні не спраўляўся схватваць хлеб, і буханкі падалі на тратуар, каціліся ў гразь.

Праходзіўшая ля магазіна адна грамадзянка атрымала ўдар буханкай кінутага хлеба. Я запытаўся ў загадчыка магазінам, чаму хлеб не носяць у магазін кошыкам, а кідаюць у гразь. Ён мне груба адказаў:

— А ваша якая справа?

Тады я папрасіў даць мне кнігу скарг, але ён адмовіўся.

21 лістапада ў 9 гадзін раніцы я купляў хлеб у магазіне № 1. Разам са мной купіла хлеб і супрацоўніца нашай установы. У час снедання яна разрэзала кавалак купленага хлеба і знайшла ў ім акурак папяросы.

Гарадская санітарная інспекцыя, як відаць, не выконвае свае функцыі па праверцы захавання ў пякарнях і хлебных магазінах санітарна-гігіенічных правілаў.

А. Леваноўскі.
г. Беласток.

Вытворчы ўздым на шостым камбінаце

Калектыў 6-га камбіната разгарнуў актыўную падрыхтоўку да пастойнай сустрэчы дня выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. 19 лістапада закончыў 11-месячную праграму ткацкі цэх. 11-месячны план выканаў і прадзільны цэх.

У апошнія дні многія рабочыя сталі перавыконваць вытворчую праграму. Вялятных поспехаў дабіліся браты-змешчыкі Курыльскія—Ізраіль і Майсей. Ізраіль Курыльскі высунуты кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета. 22 лістапада яго вылучылі начальнікам ткацкага цэха. Паранейшаму добра працуе стахановец-двухстаночнік тав. Каплан, які значна перавыконвае нормы выпрацоўкі.

За першую палову лістапада 96 процантаў прадзільшчыкаў таксама выканалі нормы выпрацоўкі.

Да зімоўкі не падрыхтаваны

Абласны выканаўчы камітэт і абком КП(б)Б у сваёй пастанове абавязалі райкомы партыі, райвыканкомы і загадчыкаў райзямаддзелаў праверыць у кожным калгасе і соўгасе становішча падрыхтоўкі да зімоўкі і забяспечыць скончэнне будаўніцтва новых, рамонт і ацяпленне старых памяшканняў для жывёлы.

Гэта важнейшае рашэнне ў калгасе імені Дзяржынскага, Ломжынскага раёна, выконваецца марудна. Старыя памяшканні для жывёлы прадзэзінфіцыраваны і ацеплены. Але ў гэтыя памяшканні жывёла не ўмяшчаецца. Пабудовай-жа і абсталяваннем другіх памяшканняў да апошняга часу ніхто не займаецца.

Многія кіруючыя работнікі раёна часта бываюць у калгасе. Але канкрэтнай дапамогі ў рабоце калгасу не аказваюць. Толькі на апошнім пасяджэнні райкома партыі было прапанавана старшыні райвыканкома тав. Данілаву адпусціць сродкі і матэрыялы для пабудовы памяшкання для калгаснай жывёлы.

Раённы зямельны аддзел павінен неадкладна прыняць усе меры к таму, каб калгасная жывёла была забяспечана цёплым памяшканнем.

П. Грышчанка.

Чаму не задавальняюць нашу законную прозьбу

11 мая гэтага года мая жонка, як спецыяліст-бухгалтар чыгуначнага транспарта, была камандзіравана на пастаянную работу ў г. Ваўкавыск. Я—галоўны бухгалтар апчадных сістэмы (у данай сістэме працую 7 год) быў камандзіраван Галоўным упраўленнем апчадкас у Вілейскае абласное ўпраўленне апчадкас. Але ў сувязі з камандыроўкай жонкі ў Ваўкавыск, з маім хадайніцтвам і хадайніцтвам Наркамата шляхоў зносін Галоўнае ўпраўленне апчадкас змяніла сваё першае рашэнне і камандзіравала мяне ў распараджэнне Беластоцкага абласнога ўпраўлення апчадкас. 17 чэрвеня я прыбыў ў Беластоцкае ўпраўленне. Работу ў Ваўкавыску мне не прадаставілі і з сістэмы гэтай не адпусцілі, а прызначылі на работу ў г. Скідэль.

Не гледзячы на маё хадайніцтва перад абласным упраўленнем апчадкас і хадайніцтва жонкі перад Беластоцкім упраўленнем чыгункі, нас не адпускаюць з работы і не даюць магчымасці жыць і працаваць разам.

В. Лісіч.
гор. Скідэль.

Кандыдаты ў дэпутаты — лепшыя стаханаўцы

Новымі вытворчымі падарункамі рыхтуюцца сустрэць дзень выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных рабочыя тэкстыльнай фабрыкі № 29.

Нядаўна калектыў удастоіўся высокай чэсці — атрымаў пераходны чырвоны сцяг Беластоцкага тэкстыльнага трэста і абкома саюза шарсцянікаў.

Першы дзень пасля атрымання пераходнага чырвонага сцяга калектыў азнаменаваў высокапрадукцыйнай стаханаўскай працай. Замест 115 процантаў выканання плана, якія даваў апаратны аддзел, 18 і 19 лістапада план выканан на 120 процантаў. Ткачы ў гэтыя дні выканалі норму выпрацоўкі на 115 процантаў.

Узорна працуе кандыдат у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных тав. Вільчэўская. Яна сістэматычна выконвае план на 140 процантаў. Такімі-ж паказчыкамі дасягнуў і тав. Клышэўскі. Добрых поспехаў у рабоце дасягнуў кандыдат у дэпутаты гарсовета старшая маталыньшчыка тав. Камельман.

Жывёла поўнасцю забяспечана кармамі

Набліжаецца зіма. Калгасная жывёла павінна зімаваць у цёплым і прасторным памяшканні. Гэта добра зразумелі ў калгасе «Ленінскі шлях», Свіслацкага раёна. У калгасе тры жывёлагадоўчыя фермы: малочна-таварная, конегадоўчая і свінагадоўчая. Памяшканні для жывёлы тут своечасова адрамантавалі, ацяплілі. Зроблена дэзінфекцыя жывёлагадоўчых будынкаў.

Калгасная жывёла таксама забяспечана на зіму ў дастатковай колькасці кармамі.

М. Барысаў.

Заахвочваюць прагульшчыкаў

Беластоцкі абласны фінансавы аддзел рашыў прэміраваць лепшых работнікаў. У лік лепшых начальнік аддзела сумеcна з сакратаром партыйнай арганізацыі тав. Лысенка вылучылі галоўнага бухгалтара Бурмакіна і начальніка бюджэтнага сектара Дрэмача, не гледзячы на тое, што першы з іх 11 верасня спазніўся на работу на 50 мінут і быў асуджаны на 4 месяцы прымусовай работы з адлічэннем з зарплаты 15 проц., а другі спазніўся на работу на 25 мінут і быў асуджан на 3 месяцы прымусовай работы з адлічэннем 20 проц. з зарплаты.

Калі інструктар абкома саюза работнікаў дзяржаўных установ звярнуў на гэта ўвагу сакратара партарганізацыі тав. Лысенка, то апошні заявіў: «Прафсаюзнай арганізацыі ніхто не даў права правяраць загады адміністрацыі і даваць указанні».

Адпаведным органам трэба зацікавіцца гэтай справай.

А. Шмідт,
старшыня абкома саюза работнікаў дзяржаўных установ.

Выдатныя паказчыкі работы

ВАЎКАВЫСК. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта). Заклік стаўбцоўскіх лесарубаў і возчыкаў знайшоў гарачы водгук сярод лесарубаў Роскага лесаўчастка. Лесарубы гэтага ўчастка ўзялі на сябе абавязацельства датэрмінова выканаць гадавую праграму і загатовіць звыш плана па 500 кубаметраў на кожную пару.

Узятыя абавязацельствы паспяхова выконваюцца. Лесарубы Іван Талай і Іван Янушка штодзённа выконваюць сваё заданне на 297 процантаў. Ад іх не адстаюць у рабоце і Сцяпан Шыбко, Васіль Янушка.

Добрых паказчыкаў дабіліся лесарубы Васіль Грынюк, Ігнат Шыбалік і Ілья Ярмолік. Іх дзённая выпрацоўка—250 процантаў.

Д. Казлоў.

По слядах нашых матэрыялаў

«БЕСТУРБОТНАСЦЬ СКІДЭЛЬСКАГА РАЁННАГА АДДЗЕЛА НАРОДНАЙ АСВЕТЫ»

Пад такім загалоўкам у нашай газеце ад 5 кастрычніка была змешчана заметка тав. М. Эйгер, у якой указвалася, што ў Скідэльскім раёне школы не забяспечаны дрывамі. Не лепш абстаіць справа і з асвятленнем. У школах няма газы. Таму вячэрнія школы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці спынілі работу. Загадчык райана тав. Гукаў гэтымі справамі мала цікавіўся.

Як нам паведаміў аддзел прапаганды і агітацыі Скідэльскага райкома КП(б)Б, факты, указаныя ў заметцы, поўнасцю пацвердзіліся. 21 кастрычніка райком партыі заслухаў даклад тав. Гукава і прыняў адпаведную пастанову. Райком абавязаў раённы выканаўчы камітэт неадкладна прыняць меры для забеспячэння школы дрывамі, а Райспажыўсаюз—газай.

У БЛАКНОТ АГІТАТАРУ

САПРАЎДНЫ ТВАР БЫЛОЙ ПОЛЬСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ І АБ ЦУДАХ У ВЫБАРЧЫХ УРНАХ

(па матэрыялах архіва)

Усе буржуазныя канстытуцыі не скупяцца сказаць некалькі красамоўных слоў аб дэмакратыі. Былая польская канстытуцыя 1921 года ў гэтых адносінах не адрозніваецца ад іншых канстытуцый капіталістычных дзяржаў. У артыкуле 96 канстытуцыі указвалася, што «усе грамадзяне роўны перад законам». Але сама канстытуцыя тут-жа абмяжоўвае правы грамадзян. У артыкуле 12 чытаем, што «выбарчым правам карыстаецца кожны польскі грамадзянін без розніцы полу, які ў дзень абвяшчэння выбараў мае 21 год, карыстаецца **поўнасцю грамадзянскімі правамі** і жыве ў выбарчай акрузе, на крайні мер, напярэдадні аб'яўлення выбараў... Права галасаваць можа быць выкалана толькі асабіста. Ваенныя на тэрміновай службе пазбаўлены права галасаваць».

Сапраўдны твар панскага рэжыму і канстытуцыі скора праявіўся ў выбарчых кампаніях.

Дзяржаўная кліка сумесна са сваімі прадажнымі прыслужнікамі буржуазіі насільна прымушалі працоўны народ аддаваць свае галасы за паноў, фабрыкантаў, ксяндзоў і ўсіх ворагаў рабочых і сялян. Ва ўмовах панскай Польшчы выбарчая кампанія ператваралася ў жорсткую барацьбу рабочых і сялян супроць буржуазіі.

Ва ўмовах тэрору камуністычная партыя, загнаная ў падполле, ажыццяўляла ў час выбарчай кампаніі палітычны блок рабочых і сялян. На барацьбу ўзнімаліся арганізаваныя масы рабочых і сялян. У ноч з 27 на 28 лютага 1928 г. (у гэты час праходзілі выбары ў сейм) на шасе каля мястэчка Індуры быў вывешан рэвалюцыйны транспарант з надпісам на рускай мове: «Далоў фашысцкі ўрад, няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад! Галасуй 13».

Урадавыя кругі імкнуліся арганізаваць у вёсках і гарадах гурткі блока садзейнічання з урадам, але гэта ім не ўдавалася.

Сяляне вёсак Індурскай воласці (гміны) Вішнеўка і Трахімы катэгарычна адмовіліся ўступіць у выбарчыя гурткі блока садзейнічання з урадам. Тое-ж самае было і ў іншых вёсках Гродненскага павета. У вёсках Міклашэвіцы, Дубна не ўдалося арганізаваць камітэт садзейнічання з урадам з прычыны ўпорнага супраціўлення ўсёй вёскі. У вёсках Малой Бераставіцкай (гмінай) воласці работа валаснога (гмінага) камітэта беспартыйнага блока садзейнічання з урадам наткнулася з боку мясцовага насельніцтва на рашучае супраціўленне. Сяляне правільна пачалі пагаварваць, што ўступаючы ў беспартыйны блок, падпісваючы яго пратаколы, падпісваюць яны тым самым за панінцыю. Распаўсюджванне такіх чутак сярод сялян, як можна было меркаваць, мела сваю крыніцу з вёсак рэвалюцыйна настроеных, як Алекшыцы, Вялікія Жукевічы, Падбагоннікі, Кавалі і Гольна.

Спісак рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага адзінства набываў сярод сялян усё большую колькасць старонікаў, што навет відаць з зводкі паліцэйскага паста ў Азёрах Гродненскага старасце: «Трэба чакаць, што па крайняй меры тры чвэрці насельніцтва будзе галасаваць за спісак № 13».

Выбары ў Гродненскім павеце прынеслі рэвалюцыйнаму рабоча-сялянскаму адзінству перамогу — 20.429 галасоў. Таму ўладамі з гэтых 20.429 галасоў за спісак № 13 былі прызнана несапраўднымі 4.230 галасоў.

Насельніцтва адносілася з вялікім недавер'ем да выбараў у былы польскі сейм. Сведчаннем гэтага можа быць наступны характэрны факт. У мястэчку Лунне, недалёка ад Гродна, у 1930 годзе некаторыя асобы адмовіліся ад таго, каб іх прозвішчы былі ўнесены ў спіскі выбаршчыкаў. Літоўскае насельніцтва мястэчка Марцінканцы і ваколічных вёсак рашыла не ўдзельнічаць у выбарах. Паліцэйскія сачылі за настроем літоўцаў і рашылі арыштаваць на час выбарчай кампаніі групалоўных літоўскіх агітатараў. У 1930 годзе перад выбарамі ў сейм у лесе каля Скідэля быў вывешан транспарант з надпісам «Смерць панам!».

Пры выбарах у сейм 16 лістапада 1930 года прадстаўнікі выбарчай камісіі ад урадавага спіска па выбарчай акрузе № 6 (Гродна, Аўгустоў, Сувалкі) зрабілі розныя махінацыі і проста тварылі «цуды» пры падліку галасоў. Прывядзем рад фактаў: 1) Старшыня ўчастковай камісіі № 34 Гродненскага павета кінуў у урну акрамя канвертаў з бюлетэнямі, паданымі выбаршчыкамі, і іншыя канверты, якія ўзяў са стала. 2) На ўчастку № 44 Гродненскага павета ў 7 гадзін вечара вынеслі ўрну з выбарчымі бюлетэнямі ў другі пакой, ключ узяў старшыня камісіі. У 9 гадзін, калі прыступілі да падліку галасоў, аказалася, што ў урне знаходзілася 84 бюлетэні з № 1 (урадавы спісак) без канвертаў і 10 пустых канвертаў. 3) На ўчастку № 29, Аўгустоўскага павета, былі дзве выбарчыя урны. Падлік галасоў праводзіўся не па той урне, у якой выбаршчыкі галасавалі, а па другой.

Наступны акт выбарчай камедыі разыграўся ў 1935 годзе. Новая польская канстытуцыя і новае палажэнне аб выбарах зусім абмяжоўвалі палітычныя правы мас. Напрыклад, канстытуцыя 1935 года ў прапіліцэйскую канстытуцыі 1921 года не мела зусім раздзела аб правах грамадзян. Права выбараў у сейм мелі грамадзяне з 24 год, а па канстытуцыі 1921 года—з 21 года. Улада сейма і сената была ў многім абмежавана. Не дзіўна, што пры такім становішчы не толькі працоўныя масы, але усе апазіцыйныя буржуазныя партыі былой Польшчы прынялі немэтазгоднымі удзельнічаць у выбарах. Кінут быў лозунг байкатыраваць выбары 14 ліпеня 1935 года.

Камуністычная партыя Польшчы арганізавала ў чэрвені 1935 года маніфестацыі і стачкі пратэсту супроць палажэння аб выбарах, вяла актыўную барацьбу супроць выбараў, супроць ППС і іншых контррэвалюцыйных партый, якія стараліся народныя масы ўтрымліваць у пасіўным байкоце.

Абмяркоўваючы вынікі выбараў, газета «Новае жыццё» № 73 за 1935 год пісала:

«Зводкі галасаваўшых паветаў паказваюць, што ў большай колькасці вёсак галасавала некалькі процантаў. А былі і такія выпадкі, калі галасавалі толькі чыноўнікі самаўпраўлення, настаўнікі і людзі, маючыя канцэсіі... У Варшаве было 50 тысяч несапраўдных бюлетэняў, гэта значыць, што нават людзі, якія за страх галасавалі, рабілі розныя роду прыпіскі, каб галасы іх сталі несапраўднымі».

Наогул, пры выбарах у сейм 1935 года больш паловы выбаршчыкаў, якія мелі права галасаваць, не ўдзельнічалі ў выбарах. Па ўсёй Польшчы галасавала, па афіцыяльных даных, 46,51 процанта, а па даных апазіцыйнай прэсы,—30 процантаў. Па Беластоцкаму ваяводству па афіцыяльных даных галасавала 57 процантаў.

Усе вышэйпрыведзеныя факты і лічбы ілюструюць сапраўдны твар выбараў у панскай Польшчы.

Л. Чванаў,
О. Любоўскі.

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

ПРЫЁМ тт. СОБАЛЕВА І ЛАЎРЫШЧЭВА БАЛГАРСКІМ ЦАРОМ БОРЫСАМ І ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ ФІЛАВЫМ

САФІЯ, 26 лістапада. (ТАСС). Учора ўдзень генеральны сакратар народнага камісарыята замежных спраў тав. Собалеў у суправаджэнні паўпрэда СССР у Сафіі т. Лаўрышчэва наведаў прэм'ер-міністра Балгарыі прафесара Філава. У 5 гадзін 30 мінут тт. Собалеў і Лаўрышчэў былі прыняты царом Борысам.

Усе сённяшнія газеты на першых старонках публікуюць паведамленне аб прыёме, а таксама змяшчаюць партрэты тт. Собалева і Лаўрышчэва.

—о—

ГЕРМАНСКАЕ АБВЯРЖЭННЕ

БЕРЛІН, 26 лістапада. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, у палітычных кругах Берліна заяўляюць, што паведамленні некаторых нью-йоркскіх газет аб новым «мірным наступленні» Германіі (г. зн. аб падрыхтоўваемых ёю мірных прапановах) з'яўляюцца выдумкай.

—о—

ПАВЕДАМЛЕННЕ ВЯРХОЎНАГА КАМАНДАВАННЯ ГРЭЧАСКАЙ АРМІІ

АФІНЫ, 26 лістапада. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне грэчаскай арміі паведаміла ўвечары 25 лістапада: «Нашы войскі, працягваючы прасоўванне ўперад, занялі некалькі новых пазіцый. Авіяцыя праціўніка падвергла бамбардыроўцы некалькі гарадоў і вёсак унутры краіны. Маецца некалькі забітых і раненых. Ні адзін ваенны аб'ект не пацярпеў.

—о—

АМЕРЫКАНСКАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯХ ПАМІЖ ІТАЛІЯЙ І ГРЭЦЫЯЙ

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, у баях за Пагрaдэс было забіта звыш 300 і ранена 700 грэкаў. Мяркуюць, што італьянскія страты яшчэ вышэй.

—о—

АМЕРЫКАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ АБ ДЗЕЯННЯХ ГРЭЧАСКАЙ АРМІІ

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Белградскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што, па маючыхся звестках, грэчаскія войскі ўночы 25 лістапада занялі вёску Леснікa. Раніцой 26 лістапада ў горадзе Паградэс адбываліся вулічныя баі. Італьянскія войскі адступілі па напрамку к Мумуліста, размешчанаму на дарозе к Эльбасану. Па маючыхся звестках, грэкі захапілі ў Паградэсе 5 італьянскіх афіцэраў і 400 салдат, а таксама два італьянскіх танкі, 2 цяжкіх гарматы, 5 грузавікоў, 9 кулямётаў і вялікую колькасць боепрыпасаў.

Па паведамленню афінскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, згодна звестак, паступаючых з цэнтральнага фронта, пасля жорсткага боя, працягваўшагася ўсю ноч, грэкі рассеялі полк італьянскіх падмацаванняў. Італьянцы спрабавалі прыкрыць адступленне сваіх войск.

АФІНЫ, 26 лістапада. (ТАСС). Па атрыманых тут звестках, грэчаскія войскі завяршаюць акружэнне Аргіракастрона. Грэчаскія войскі пачалі акружэнне Клісуры (Кельчуры), на паўночны захад ад горада Прэмет.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 26 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандавання германскай арміі:

Германская падводная лодка патапіла непрыяцельскія судны водазмяшчэннем у 41.400 тон. У ноч на 25 лістапада германская авіяцыя зрабіла налёты на Лондан. У цэнтры горада і ў раёнах па абодвух берагах Тэмзы адзначаны вялікай сілы ўзрывы і пажары. Другія злучэнні бамбардыроўшчыкаў у тую-ж ноч бамбардыравалі ваенныя аб'екты Брыстоля. Знішчана вялікая колькасць складаў сыравіны і прадпрыемстваў. У рэзультаце бамбардыроўкі знішчаны таксама 3 газавых заводы. Далейшай бамбардыроўцы падвергліся ў тую-ж ноч некалькі гарадоў Цэнтральнай і Паўднёвай Англіі. У сувязі з неспрыяючымі ўмовамі надвор'я дзейнасць авіяцыі на працягу ўсяго дня 25 лістапада была нязначнай. Невялікія злучэнні лёгкіх бамбардыроўшчыкаў паспяхова атакавалі выключна важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў Паўднёвай Англіі, скінуўшы на іх бомбы.

Дальнабойныя батарэі палявой і марской артылерыі абстралялі 25 лістапада ўвечары адзін англійскі караван суднаў, якія спрабавалі прарвацца да заходняга выхада Ла-Манша. Караван суднаў быў рассеян.

У апошнюю ноч непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы над некаторымі раёнамі Паўночна-Заходняй Германіі, якія прычынілі нязначны матэрыяльны ўрон толькі ў адной вёсцы.

На працягу ўчарашняга дня непрыяцель страціў 2 самалёты. З германскай стараны страт не было.

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў сувязі з распаўсюджваемымі англійскімі радыёстанцыямі чуткамі аб меўшай месца ў ноч на 24 лістапада бамбардыроўцы кварталаў Берліна—замежныя карэспандэнты, таксама ваенныя атташэ раду дзяржаў аглядалі ўчора вакзалы і месцы, з'явіўшыяся, па сцвярджэнню англійскага радыё, аб'ектамі бамбардыроўкі. Журналісты і ваенныя атташэ, наведаўшыя вакзал Путліцерштрас, Лертскі, Патсдамскі вакзалы, не знайшлі ніякіх слядоў бамбардыроўкі. Вакзалы працавалі нармальна.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 26 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, на працягу ўчарашняга дня невялікаму злучэнню германскіх бамбардыроўшчыкаў удалося прарвацца да прадмесця Лондана. Незадоўга да наступлення цемнаты непрыяцельская авіяцыя зрабіла налёт на горад, які знаходзіцца на ўзбярэжжы графства Кент. У рэзультаце бамбардыроўкі разбурана некалькі дамоў і ранен нязначны лік людзей. Бомбы былі скінуты германскімі самалётамі на горад у раёне паўднёвага ўзбярэжжа Англіі, а таксама на 2 іншых пункты ў Паўднёва-Усходняй Англіі. Матэрыяльны ўрон нязначны. Афяр не было. Адзін непрыяцельскі бамбардыроўшчык збіт.

Другі раз з часу масавых налётаў германскай авіяцыі на Англію ў Лондане, пачынаючы з поўначы, не было аб'яўлена ні адной паветранай трывогі.

У ноч на 26 лістапада англійскія дальнабойныя гарматы праз Па дэ-Кале абстралялі германскія артылерыйскія батарэі на французскім узбярэжжы. Германскія гарматы, устаноўленыя паблізу мыса Гры Нэ, адкрылі адказны агонь.

Як паведамляе англійскае міністэрства авіяцыі, цяпер стала вядома, што ў ноч на 26 лістапада некалькі бомб скінута ў заходняй Англіі. Бамбардыроўкай прычынен невялікі ўрон. Паміма гэтага, у ноч на 26 лістапада над Англіяй не адзначана больш ніякай дзейнасці непрыяцельскай авіяцыі.

Англійскія самалёты ў ноч на 26 лістапада бамбардыравалі докі двух партоў Паўночна-Заходняй Германіі.

АНГЛА-ІТАЛЬЯНСКАЯ ВАЙНА

ЛОНДАН, 26 лістапада. (ТАСС). У камюніке камандавання англійскіх паветраных сіл, апублікаваным у Каіры 25 лістапада, гаворыцца, што англійская авіяцыя зрабіла налёты на Дзерн, Апалонію, Тобрук і Бардзію. У Дзерне і Апалоніі бомбы былі скінуты на казармы. Пры бамбардыроўцы Тобрука пашкоджаны будынкі ваеннага характару. У Бардзіі пашкоджан адзін непрыяцельскі самалёт. Усе англійскія самалёты вярнуліся на свае базы.

У італьянскай Усходняй Афрыцы англійская авіяцыя зноў бамбардыравала Асаб, а таксама казармы ў Азозе і ваенны лагер у Салейе-Акрамя таго, быў зроблен паспяховы налёт на Губу.

24 і 25 лістапада непрыяцельскія самалёты зрабілі два налёты на Мальту.

Англійская зенітная артылерыя адкрыла інтэнсіўны агонь. Самалёты праціўніка абмежаваліся кулямётным абстрэлам аэрадрома. Прычынены нязначныя пашкоджанні. Афяр няма.

Англія намерана набыць у ЗША ваенныя караблі

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню лонданскага карэспандэнта газеты «Нью-Йорк геральд трыбюн», англійскі пасол у ЗША Лоціан прывёз з сабой у Вашынгтон мемарандум, у якім гаворыцца, што для абароны свайго гандлёвага флота Англія адчувае патрэбу ў неадкладнай закупцы, арэндзе, ці атрыманні ўзаемаабразна ад ЗША трох лінкораў, 6 крэйсераў і 100 эсмінцаў. Відавочна, Рузвельт і Лоціан учора абмяркоўвалі гэты мемарандум.

ЛОНДАН, 26 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у аўтарытэтных лонданскіх кругах заяўляюць, што паведамленне нью-йоркскай газеты аб тым, што Лоціан прывёз з сабой мемарандум, у якім выказваецца жаданне англійскага ўрада купіць, арэндаваць ці атрымаць узаемаабразна ў ЗША 3 лінкоры, 6 крэйсераў і 100 эсмінцаў, з'яўляецца неабгрунтаваным.

ІТАЛА-ГРЭЧАСКАЯ ВАЙНА

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, грэчаскія войскі ўступаюць у ваколіцы Аргіракастрона. Баі адбываюцца на паўднёвым захадзе ад Аргіракастрона, дзе грэкі пагражаюць адрэзаць адступаючыя італьянскія войскі. У цэнтральным сектары італьянскія войскі пакінулі свае ўмацаваныя пазіцыі на гары Островісе. У раёне Паградэса кавалерыйскія часці праследуюць адступаючыя італьянскія войскі.

У грэчаскіх кругах заяўляюць, што страты як у грэчаскай, так і ў італьянскай арміях параўнаўча невялікія. Грэчаская авіяцыя бамбардыравала ў Албаніі Берат, Эльбасан і Тэпелене.

Калона грэчаскіх войск, якая прасоўваецца з Корчы, захапіла 200 італьянскіх грузавікоў і разнастайныя ваенныя матэрыялы ў раёне Паградэса. Узята ў палон некалькі сот італьянцаў.

Англійскія паветраныя сілы 24 лістапада падвергді інтэнсіўнай бамбардыроўцы Дурацо.

Паводле паведамлення агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаскі друк сцвярджае, што вялікая частка італьянскай галоўнай лініі абароны на паўночным берагу ракі Дэвол разбурана. Грэчаскія войскі ўступілі ў Паградэс. Італьянскія войскі адступаюць к лініі абароны на рацэ Шкумба.

БЕЛГРАД, 26 лістапада. (ТАСС). Газета «Палітыка» паведамляе, што італьянскія войскі стараюцца ўмацавацца на другой лініі абароны. На Паўднёвым фронце грэкі занялі Каніспаліс. На Цэнтральным фронце грэкі занялі гарадок Фурка.

Як паведамляюць афінскія газеты, крывавы штыкавы бой на гарах ля Корчы працягваўся 9 дзён. Грэчаскія войскі паказалі пры гэтым высокія баявыя якасці.

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, у апошнім камюніке вярхоўнага камандавання грэчаскіх узброеных сіл гаворыцца, што грэчаскія войскі, працягваючы наступленне, занялі некалькі новых пазіцый.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, усяго грэкамі ўзята ў палон 7 тысяч італьянцаў.

—о—

Зводка італьянскага камандавання

РЫМ, 26 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандаванне паведамляе: «На грэчаскім фронце атрады праціўніка, высадзіўшыяся на ўзбярэжжы Эпіра, былі часткова знішчаны, часткова ўзяты ў палон разам з сваёй зброяй. Наша авіяцыя зрабіла многалікія атакі ва ўсёй зоне аперацый. Неаднаразовай бамбардыроўцы падвергліся ўмацаванні вострава Корфу. У раёне Дурацо нашы знішчальнікі збілі 2 непрыяцельскіх самалёты.

Авіяцыя праціўніка зрабіла налёты на астравы Лерос і Стампалія (Додэканезскія астравы). Пашкоджана некалькі будоўляў. Забітых і раненых няма. Збіта 5 самалётаў праціўніка.

Непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы на Асаб; маецца 1 забіты і 4 раненых. Матэрыяльны ўрон нязначны».



Дом бацькоў паэта А. Міцкевіча ў г. Навагрудку (Баранавіцкая вобласць), у якім да 85-гадовага юбілею з дня яго смерці адкрываецца музей імені А. Міцкевіча.

Фота В. Лупейка. Фотахроніка БЕЛТА.

Наш пясняр

Міцкевіч — найвялікшы польскі паэт — увайшоў у сэрца кожнага з нас. Селянін і інтэлігент, рабочы і інжынер з аднолькавым захапленнем чытаюць творы гэтага вялікага паэта і адначасова глыбока шануюць яго. Кожны яго сказ у простай форме заключае жыццёвую праўду і таму глыбока ўздзейнічае на чытача. Міцкевіч—паэт, асабліва любімы моладдзю. Чытаючы верш «Ода да маладосці», мы знаходзім у ім увасабленне сваіх лепшых імкненняў.

У гэтым вершы Міцкевіч гаворыць моладзі аб тым, што яна пераможа ўсе перашкоды, якія стануць папярок дарогі да мэты. Моладзь, поўная энтузіязму, можа тварыць цуды, можа ператварыць існуючыя звычаі і парадкі.

У капіталістычных краінах на шляху моладзі да здзяйснення яе ідэалаў стаяць непераманальныя перашкоды. У нас, у краіне сацыялізма, пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, моладзь мае магчымасць ажыццявіць ва ўсіх галінах дзейнасці свае імкненні.

Да нас, у сацыялістычнае сёння, Міцкевіч прышоў як жывы, як наш пясняр. Ён паўстаў перад намі ва ўсёй сваёй велічы рэвалюцыйнага дэмакрата, адданага справе барацьбы за свабоду прыгнечаных народаў. У сваіх творах паэт востра выступаў супроць існуючага бяспраўя, супроць цара, супроць прыгнечання аднаго народа другім.

За гэта ён быў сасланы. Аднак ссылка не змагла змяніць прагрэсіўных поглядаў паэта. І пазней у Парыжы з «Трыбуны народаў» гучэлі на ўвесь свет яго палкія словы аб свабодзе і раўнапраўі народаў.

Яго найглыбейшае жаданне, выражанае ў эпілогу да «Пана Тадэуша»,—каб дажыць да такіх часоў, да такой радасці, каб кнігі яго трапілі ў сялянскія хаты—ажыццявілася.

М. Максімлюк
і С. Скшэчко,
студэнты Беластоцкага педінстытута.

Ушаноўваюць памяць паэта

ГРОДНА. **(Па тэлефону).** Працоўныя горада і раёна ўшаноўваюць памяць вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча. У школах, клубах і іншых грамадскіх месцах адкрыліся выстаўкі, адлюстроўваючыя творчы шлях паэта.

На прадпрыемствах і ўстановах праведзены гутаркі. Па школах, тэхнікумах наладжваюцца літаратурныя вечары.

На вечары, які адбудзецца ў Гродненскім настаўніцкім інстытуце, даклад аб літаратурнай дзейнасці Міцкевіча зробіць дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, кандыдат у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета, паэт Філіп Пестрак.

У 11-й школе ў чэсць юбілею выпушчан спецыяльны бюлетэнь. Па класах праведзены гутаркі. Днямі адбудзецца агульнашкольны вечар, прысвечаны памяці паэта.

СНЯДАВА. **(Па тэлефону).** Працоўныя Снядаўскага раёна ўрачыста адзначаюць 85-годдзе з дня смерці Адама Міцкевіча.

У школах, у хатах-чытальнях раёна адбыліся гутаркі аб жыцці і дзейнасці паэта. У вёсцы Шумава даклад аб творчым шляху Адама Міцкевіча зрабіў настаўнік мясцовай школы тав. Сепюч.

КОНКУРС ВАКАЛІСТАЎ

Па ініцыятыве і пры метадычнай дапамозе музыкальнага сектара абласнога Дома народнай творчасці ў многіх калектывах мастацкай самадзейнасці нашай вобласці створаны гурткі сольнага спявання, дзе адароная моладзь асвайвае сапраўдную вакальную культуру.

Лепшыя ўдзельнікі вакальнай самадзейнасці рыхтуюцца зараз да першага Усебеларускага конкурса вакалістаў. Гэты конкурс будзе праведзен у трох турах: першы тур для Беластока і вобласці—адбудзецца 5 снежня, другі і трэці тур адбудуцца ў Мінску 25 снежня. У праграме конкурса творы розных стыляў для камернай і эстраднай групы.

Лепшыя ўдзельнікі конкурса будуць узнагароджаны каштоўнымі прэміямі і пачотнымі дыпломамі.

І. Кучыковіч,
метадыст беластоцкага Дома народнай творчасці.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ

Адрас рэдакцыі: БССР, г. Беласток, будынак аблвыканкома. Тэлефоны: адказнага рэдактара—17-62, адказнага сакратара—49, аддзелаў прапаганды і партыйнага—16-10, эканамічнага аддзела—праз камутатар аблвыканкома, № 23, аддзел пісем—праз камутатар аблвыканкома, № 22. Выдавецтва і бухгалтэрыя—14-32.

УБ—108. Тыраж 12.000 экз. Друкарня Беластокдрук.